Раман–фэнтэзі з працягам
Працяг. Друкуецца з № 4 2019 г.

*Маргарыта Латышкевіч*

# Век людзей

*(працяг)*

26.

Цераз яры, цераз кустоўе, узбіваючы сухое лісце ды зіхатлівыя россыпы кропляў, паўз бярэзнікі, дзе дрэвы, падавалася, пужліва расступаліся перад вершнікам, паўз пагоркі з абвугленымі і склізкімі ад вільгаці зрубамі спаленых хутароў, паўз абымшэлыя валуны, падобныя да непаваротлівых сонных жывёлін. Паўз — і праз, наскрозь, ажно дух захоплівала ад хуткасці, ажно пена ўскіпала на рэбрах і шыі варанога. І падавалася: рухаецца не конь, які быццам завіс у паветры разам з каліўцамі сухіх траў ды камякамі глiністай глебы, але сама прастора вакол, якая, пакорлівая ўпартай волі, у стракаценні, у скавытанні ветру нясецца насустрач.

Вогненная ніць запела мацней, і загула, і застагнала зямля пад цяжкімі крокамі. *«Блізка*, — шапталі знакі на клінку, — *так блізка, блізка, блізка*».

Распалены голад успыхнуў ярка і люта, запалымнеў на зморшчаных ягадах каліны, агніста заблiскаў у цёмных лужынах. І раптам — знік, як пад зямлю праваліўся, быццам схаваўшыся. Донай прытрымаў разгарачанага скачкай каня, слізгануў невідушчым паглядам па карункавым вецці бярэзнікаў, па сырых пагорках, спавітых вусцішнай прагай. Пагоркі абступілі цесным колам, навалiліся непрыязна, збіваючы са следу. Але нітачка голаду была зусім побач, празрыстая, як павуцінка, і тое, што гэтым голадам жыло, што падступна ўнікала вачэй, рагатала і вантробна рохкала. І не здавалася, не адступала, бегла, чуючы сваіх ахвяр, цягнула па рыжых касмылях травы смуродлівае бруха.

Цягнулася да безабаронных людскіх жыццяў, драпежна шчоўкаючы атрутнымі ікламі.

За бліжнімі пагоркамі ўсплёснула чалавечымі крыкамі ды конскім успуджаным іржаннем. І, грамчэйшы за ўсё, узвіўся ў бледнае неба не чалавечы і не звярыны крык, а вычварны, вусцішны лямант, ад якога кроў застывала ў жылах. Навіпольскі вараны ўзвіўся на дыбкі, так што давялося падацца ў сядле наперад, аслабіўшы павады, абхапіўшы скакуна за ўзмыленую шыю.

— Ціха, ціха, — зашаптаў Донай варанаму ў вуха. Той зафыркаў, затрос грываю, ужо стоячы на ўсіх чатырох, і слухмяна рушыў наперад, калі Донай зноў даў шпоры.

З вяршыні пагорка адкрылася дарога — мяккія каляіны, што кружылі сярод прывідных бярэзнікаў. Свежасці не засталося і звання: Донаю ў твар патыхнула густой гніллю ды смуродам разгарачанай пачварнай тушы, а яшчэ — свежай крывёю. Прыкрываючы твар рукавом, задыхаючыся, ён разгледзеў на дарозе разбітую карэту з чацвёркаю мёртвых коней і з паўдзясятка ўзброеных вершнікаў, што збольшага бязладна кружылі вакол на ашалелых ад жаху скакунах.

— Трымаць строй! Трымаць, я сказаў! — крычаў нехта сарваным голасам, і рэха несла над пагоркамі раззлаванае, але бездапаможнае «…аць! …аць!».

Над мёртвымі коньмі і нерухомым фурманам, які ніцма ляжаў у цёмнай лужыне, пагойдваючыся на шматлікіх бледных нагах, пагрозліва завісла касматая капа. З ашчэранай пашчы, што прарэзвала бруднае чэрава ўздоўж, капала цёмная атрутная сліна.

— Кадук, — працадзіў Донай.

Вараны, узмахнуўшы галавою, зноў устаў на дыбы, заржаў тоненька, баязліва, затрос пярэднімі нагамі, завальваючыся назад. Донай таропка вызваліў ногі са страмён, дазволіўшы вараному ўпасці: супакойваць яго цяпер не было часу. Конь зафыркаў, падняўся, з іржаннем рынуўся ў бярэзнік, шукаючы схову між дрэваў. А Донай, паслізгваючыся і блытаючыся ў палынах, пабег па схіле ўніз.

Аглушальны жаночы віскат узняўся ўверх разам з новым крыкам кадука, ад якога прыселі коні пад вершнікамі ў алых плашчах. Свет са злым скрыгатаннем раздрабіўся адно на чорнае і белае, выцвіў, як выцвітаў звычайна, калі ў Доная атрымлівалася адшукаць шчыліну між імгненнямі, праскочыць, праціснуцца ў прарэх у самім часе. І замёр, заледзянеўшы, і застыў кадук, душачыся ўласным лямантам.

Ручай, вызваліўшыся ад ножнаў, звонка запеў, цягнучы доўгую пагрозлівую ноту, загарэўся яркім белым святлом. Чароўныя знакі пелі сярэбранымі галасамі, прарасталі з дзяржальна ў Донаеву далонь, быццам змяіныя звівы каранёў, віліся вышэй, да запясця і локця, прывязваючы і ўмацоўваючы, так што Ручай быў не столькі зброяй, колькі часткаю самасці, жывым працягам рукі.

Спеў рун кружыў галаву, разбіваў і разрозніваў думкі. І Донай, увесь разбіты, разрознены, быў віхураю, быў пранізлівым подыхам халоднага ветру, поўнага дробных часцінак вільгаці і драбочкаў нябачнай адсюль, але ўсюдыіснай, вялікай, вечнай ракі. Сабою — і ракою, і ветрам — Донай ударыў па ненажэрнай чарнаце, што звівалася пад касматым футрам, як бы паедзеным моллю. Ручай, бліснуўшы маланкава, сякануў па адной з бледных ног, прыкрытых рагавымі пласцінамі, — і тая, торгаючыся, адляцела, а частыя кроплі цёмнай крыві, слаба падрыгваючы, завіслі ў паветры.

У гэтай нерухомасці, ледзь улоўнай, амаль недасяжнай, прыхаванай на стыку між асобнымі імгненнямі, была свая правільнасць, свая прыгажосць, тым саладзейшая, тым ярчэйшая, што ўцякала, прасочвалася між пальцаў. Донай выдыхнуў аблачынку марознай пары — і ва ўласным застылым дыханні заўважыў вытанчаныя ўзоры, выкладзеныя марознымі крышталікамі, і не мог не залюбавацца.

Крышталікі тут жа асыпаліся, бо імгненні зноў рынуліся, паляцелі. Кадук ад удару і — збольшага — ад нечаканасці адкаціўся ўбок, шчоўкаючы зубамі, а брыдкая лапа так і засталася ляжаць, адно сачылася смалістаю чарнатой. Донай, пераводзячы дыханне, ацёр потны лоб — і павярнуў галаву, быццам апечаны позіркамі збоку.

З перакуленай карэты з начыста знесеным верхам паварочваўся да яго, адсопваючыся і цокаючы, пан Адолік. А побач з ім дрыжала князёўна, бледная як смерць, выпацканая ў чужой крыві — мабыць, сваёй служкі, бялявай панны, зараз распасцёртай на зямлі.

«Донай...», — бязгучна сказала Амена і ўтаропілася не міргаючы, так, быццам аніяк не магла паверыць таму, што бачыць, быццам спала з расплюшчанымі вачыма.

— В-выр… — праквакаў, у сваю чаргу, князеў цесць, але тут жа падавіўся словам, палез дрыготкаю пухлай рукой за стаячы каўнер, выцягнуў залаты амулет светлых багоў, зашаптаў беднымі вуснамі словы малітвы. Кадук, пахрустваючы суставамі, ненатуральна іх выкручваючы, патроху ўздымаўся над узбочынай.

— Ваўчаня, — пракакатаў гулка. — Я чую цябе, ваўчаня!..

Кадук напяўся, надзьмуўся, плюнуў атрутаю — і схібіў, бо ў Доная атрымалася ўхіліцца. Атрутная лужынка, на якой ускіпалі і тут жа лопаліся пухіры, з ціхім шыпеннем раз'ядала глiністую каляіну. А пачвара глядзела, уважліва глядзела паглядам неіснуючых вачэй, выска-

ляла жоўтыя крывыя іклы, прынюхваючыся. Тонкая нітачка голаду цягнулася да бяздоннай пашчы, за якой клекатала чарната. Ледзь заўважная пунсовая нітачка, што мацнела, цяжэла, налівалася вусцішнай сілаю.

Голад, што звіваўся, завязваўся вузламі, бушаваў і шалеў, заключаны ў нязграбнае касматае цела на хісткіх нагах, раптам ударыў невыносным крыкам, ад якога закладвала вушы, ад якога знесла ўбок і разбітую карэту, і мёртвых коней. І ўсё вакол прыйшло ў рух. Доная змахнула назад, на ўзбочыну, як парушынку, абляпіла твар пачварыным гарачым дыханнем. Хутчэй па натхненні ён выставіў наперад заклятую зброю, як бы рассякаючы пунсовыя ніці голаду, адольваючы вывернуты спеў цемры іншым — сярэбраным, звонкім, як рака. Крык перарваўся, заглух у кадуковай пашчы. Пачвара, зноў плюнуўшы атрутай, выцвіла, губляючы рэчыўнасць, з крыкамі закружыла вакол. Ужо з небыцця кінулася цяжкаю грамадай на аднаго з вершнікаў, што ніяк не мог справіцца з канём, навалілася зверху, ажно храбуснулі косткі.

Кадук прагна ўхапіў чалавека пашчай, паматаў галавою — і адкінуў далёка ўбок, да яра з маладымі ялінкамі, быццам анучную ляльку. Адкаціўся пусты шлем, чалавек так і застыў, перакручаны, пераламаны. А Звер, заліты крывёй, зарагатаў і забулькаў, затупатаў, з лёгкасцю раскідваючы іншых вершнікаў.

Адзін з пунсовых плашчоў, развярнуўшы-такі ашалелага каня, наляцеў на пачвару, сekануў з прыдыханнем. Толькі меч адскочыў, не прынёсшы асаблівай шкоды, а яго ўладара кадук змахнуў з сядла адным ударам, паслаўшы наўздагон атрутны плявок. Мечнік глуха ўскрыкнуў: атрутаю лінула яму ў твар, і забрала пачало аплываць, плавіцца пад смалістаю чорнаю вадкасцю, як масла ў спёку.

Звер, паваліўшы каня ды вырваўшы з крупу кавалак мяса, з грымотным тупатам рвануўся быў наперад, да скінутага мечніка. Донай, аднак, ужо быў побач — падкаціўся пад кадукова бруха, секануўшы кордам па бледных лапах. Звер шалёна зароў: спавітая чарамі зброя пакідала на ягонай плоці барвовыя апёкі, быццам сталь корда была распалена дабяла. Апёкі пакрываліся чорнаю коркай, ды не зарасталі, і абрубак ссечанай раней лапы, чорны, закарэлы, не адрастаў нанова. Мусіць, чары на Вотанавым кордзе шкодзілі пачвары не менш за ўкусы наточанай сталі — а можа, нават болей.

А Донай зноў быў віхураю, віўся вакол Звера, джалячы светлым клінком, таропка ўнікаў іклоў ды атруты, разбіваў халодным лязом струмені ляманту, напоенага агністым голадам. Быццам ганчак, нёсся за пачвараю, што ўкрывалася ценямі, спрабуючы схавацца ў небыцці. Донай прабягаў за Зверам між імгненнямі, штораз глухнучы ад металічнага бразгату часу. Успамінаў — дзесьці на дне самасці, бо Доная не засталося, адно раз'юшаны віхор — восеньскія вішні ў Ружыцы ды ўдары дубінак. І ён танчыў гэтаксама, як там і тады, як яго вучылі, балюча ўбіваючы навуку: па коле, і выпад, і ўхіленне, а тады адскок і зноў выпад, а пасля — зноў кола. Вечнае кола.

*«Бо як сусветны змей угрызаецца ўва ўласны хвост,* — пелі белыя прошчы, пранізваючы сваімі галасамі ўсё вакол, — *так і час закручваецца ў кола»*.

А ўкруг кола смяртэльнага танца са Зверам сціскалася іншае, цяжкае, клалася ледзяным вянцом на скроні. Лускавінкі інею ўздыхалі, асядалі ў Доная на рукавах, на пласцінах даспеху, замгляючы сталь подыхам сівой сцюжы. Кадук, падціскаючыся, енчачы, склізкім камяком цемры поўз у небыцці, і па кволых нітачках, што працягваюцца між Калісь, Цяпер ды Пасля, Донай бег за ім, ляцеў за крывавым следам ненатольнай прагі.

І павярнулася кола. Донай, страціўшы апірышча, бяссільна падаў у бруд, а побач гарэў абоз і заходзіўся рогатам той, іншы, упаляваны кадук, разбухлы, раскормлены ўспамінамі

і кашмарамі. Па вераснёўскіх лужынках караскаліся вострыя льдзінкі, а з густой чарнаты, што зрабілася небам, сыпаў ці то снег, ці то попел.

— Я бачу цябе, відуш!.. — крычала чарната і смяялася. Заходзілася не вантробным рогатам кадука, але халодным смехам таго, хто валодаў іністым клінком, хто рэзка цягнуў на сабе бязважкія ніці часу.

Донай адкочваўся, слабеючы, збягаў, паслізгваючыся, ад новага выпаду клінка і чуў, як стогне зямля пад крокамі паляўнічага. Чуў, як з шоргатам і змяіным прысвістам распаўзаюцца, разгортваюцца змярцвелыя плечы інею, які драпежна шчэрыцца празрыстымі ікламі.

Іней абыходзіў цесным колам, вырастаў шкляною сцяною, спавіваў, закоўваючы ў кайданы, трымаючы, не дазваляючы ўнікнуць, скінуцца нястрымным белым агнём.

— Скажы мне, што бачыш, вырадак, — здзекліва загадваў той, закаваны ў лёд, быццам у даспех.

Цяжкая металічная рукавіца сціскалася ў Доная на горле, а Донаевы ногі боўталіся над зямлёю: паляўнічы быў вышэйшым за яго на дзве галавы, не меней.

Бездапаможна ловячы паветра ротам, Донай праз хісткую заслону слёз глянуў паляўнічаму ў вочы — у яркія зялёныя агні, што свяціліся ў проразях шлема з ледзяною каронай. І ўпаў у тыя агні, як у палонку, і за сцюжай ды чарнатой пабачыў — скрозь звон крыві ў вушах — залу пад зорным купалам, на якім свяцілі незнаёмыя сузор'і, і пышнае баляванне, і самога сябе ў коле каменных сталоў. Самога сябе, які ўпарта кідаў у тыя самыя вочы цяжкія, размераныя, страшныя словы. Словы, якія трывожылі ніці часу, прымушалі іх пець, быццам струны.

— Бачу, — з высілкам прахрыпеў Донай, ашчадна падхопліваючы пацеркі слоў за самім сабой, — тваю кроў на снезе. Кроў, якая не прарасце новым жыццём, якая…

Разгневаны паляўнічы, каранаваны льдом, злосна ўскрыкнуў і грэбліва адкінуў Доная прэч. Той упаў і ў падзенні, бліснуўшы ледзяною луской, быццам уніклівы аджгір, даў нырца між імгненнямі — у нябыт, у няўлоўнае, хуткаплыннае Ніколі-і-Нідзе.

— Хлус!.. — раз'юшана крычаў той, у ледзяной кароне. — Вырадак!..

Іністыя плечы пацягнуліся, пакорлівыя волі паляўнічага, каб змяць, здушыць, знішчыць, — але Донай ужо стаў няўлоўным белым агнём.

І павярнулася кола. Донай вольным павевам ветру пранёсся над вялікаю Вугерай, разганяючы чаек, бездапаможна заблытаўся ў ветразях цяжкой ладдзі і абрынуўся ў ваду, высока ўзняўшы пырскі. Павольна падаў ніжэй і ніжэй, адчуваючы за сабою прадонне, пругкі дотык хваль і пранізаны сонцам цяжар рачнога цела. Кадук касматым ценем мільгануў ніжэй, цягнучы за сабою налітую нянавісцю і прагаю ніць.

*«Здзейсні маю помсту, дзіця*, — шаптала вада, — *а ў патрэбе — толькі пакліч па імені. Тады з'яўлюся, каб ахоўваць і бараніць, і стану поплеч».*

— Але як тваё імя?.. — прашаптаў Донай, выпускаючы з рота рой сярэбраных бурбалак.

А рака абдымала мацней, ласкава і дужа, і хвалі яе былі мацярынскім чэравам, і сырая цемра аблягала, закалыхвала.

І павярнулася кола. Донай вываліўся з шалупіння ценяў, перакуліўся цераз галаву і цяжка ўпаў у палын, адплёўваючыся і захлынаючыся, як апрытомнелы тапелец. А над ім выбіраўся з небыцця, набрыняў цялеснасцю кадук, і па поўсці Звера ўсё яшчэ струменіла вада, а цёмныя стужкі водарасцей слаліся да зямлі, блыталіся на вычварных клюшнях на брыху. Пашча раскрылася, патыхаючы жарам і гніллю. Смуродлівая смалістая чарната кіпела ўнутры, саладкавата патыхала мярцвячынай. Донай усляпую секануў па прагных клюшнях, кадук зароў, навальваючыся ўсёй тушай, — і раптам адхіснуўся, аступіўся, з лямантам закруціўся на месцы.



Донай падняўся, патрэсваючы галавою, аціраючы лоб, і згледзеў: у кадуковай поўсці трапяталіся стрэлы, з чырвоным і з белым апярэннем.

Нехта задзірыста прысвіснуў. Донай зірнуў на бярэзнік, што вянчаў суседні пагорак, — і згледзеў там Вельса і Сташку, абодвух з напятымі лукамі. Ясь з'язджаў, спатыкаючыся раз-пораз, па схіле і на бягу вызваляў залацістае цела лютні з палону скуранога гарба, а за ім бег Стаўры — маленькая навальнічная хмара, поўная грознага сабачага рыку.

— Ззаду!.. — крыкнуў Ясь, папярэджваючы.

Донай крутануўся і адскочыў, унікаючы яраснага рыўка пачвары. А лютніст, выскаліўшыся, звыклым дотыкам крануў струны.

Ураз музыка рванулася Зверу насустрач, ярасная, вогненная. Узвілася барвовымі языкамі агню — спачатку тонкімі і пляскатымі, быццам з паперы выразанымі, пасля ўсё болей і болей сапраўднымі.

*«Порсткае, прыўкраснае, пагрозлівае,* — пела лютня, заклінаючы, — *палкае, пекнае полымя пранізвае, падпарадкоўвае, перастварае пачварнае…»*

— …У прах, — выраніў Ясь з вуснаў, быццам упусціў перліну. І слова пакацілася, абрастаючы калматай вогненнай поўсцю, з трэскам, з шыпеннем звіваючыся ў агністы камяк, ад якога так і павявала жарам. Гэты камяк, закруціўшыся ў паветры, паў на Звера — і кадук заскавытаў, закачаўся па зямлі. Упарты агонь караскаўся па ягонай поўсці, весела патрэскваючы, ды не пераскокваў на адсырэлыя травы. А струны ўсё пелі, паддавалі жару — горача, горача, прапякаючы да касцей, глыбока ўядаючыся ў кадуковую шкуру.

Звер, выкруціўшыся, раз'юшана ўдарыў цяжкою лапай па Ясю — і той, ахнуўшы, пакаціўся па зямлі, і вогненная музыка згасла, рассыпалася снапом калючых іскарак. Стаўры, падскочыўшы, учапіўся ў кадукову лапу і з сярдзітым бурчаннем пачаў рваць яе зубамі. Донай тым часам засланіў лютніста ад новага ўдару, секануўшы па клюшні звонкім кордам.

Стаўры адляцеў убок са шчанячым віскатам: кадук строс яго з сябе. Свіснула і ўпілася ў разбухлы сустаў Сташчына белапёрая страла, а Вельс, нечакана апынуўшыся побач, зняў з пояса і шпульнуў у кадукову пашчу зырка-блакітную бутэлечку. Шкло рассыпалася, змесціва ўспенілася на языку Звера, паўстала задушлівай парай. Пачвара закашлялася, захісталася, захлынаючыся слінай, — і яшчэ адна белапёрая страла затрапяталася ў Звярыным нёбе.

Кадук дробна закалаціўся, цяжка заваліўся на бок і заціх, сыходзячы крывёю і атрутай, што збіраліся, змешваючыся, у льсняную лужыну. Стаўры, абыходзячы звярыную тушу па шырокім коле, непрыязна бурчаў. Донай дапамог Ясю падняцца на ногі і кіўнуў Вельсу. Той адказаў кіўком ды, вярнуўшы лук за спіну, выцягнуў з ножнаў Лівень. І клінок запеў радасна, як летняя залева, перагукваючыся з кордам-блізнём, заззяў белым полымем.

— Пан… Донай?.. — мовілі побач.

Донай узняў вочы і пабачыў гарбаносага пана Шчэрбу, з аплаўленым шлемам пад пахай. Князеў рыцар, адсопваючыся, то касіўся на нерухомага кадука, то з сумневам паглядаў на Доная.

— Гэта і праўда кадук, — насмешліва мовіў Вельс, адказваючы адразу на ўсе на Шчэрбавы незададзеныя пытанні. — Так, гэта самы сапраўдны кадук. І так, гэткі ж самы быў мінулым разам. І — так, мой брат забіваў і не такіх.

— Багі ж мае светлыя… — прашаптаў Шчэрба, дрогкай рукою асяняючы сябе ахоўным знакам.

Донай нахмурыўся і прабурчаў дзеля справядлівасці, што насамрэч у адзіночку ён ніводнага Звера не забіваў.

— І ён… падох? — нахмурыўся Шчэрба. — К-кадук? Ужо… забіты?

— Яшчэ не зусім, — працадзіў Донай і гукнуў да траіх княжых вершнікаў, што, таксама агаліўшы зброю, асцярожна падступалі бліжэй да Звера: — Назад, вы ўсе!..

Мусіць, нешта ў Донаевым голасе было такое, што змусіла тых, агаломшаных нападам, страхам, крывёю ды шалам коней, прыпыніцца. І ў час: пачвара сутаргавата варухнулася, зарыла лапамі зямлю, забулькала. А ўнутры ўжо абудзілася тое, што хавалася ў чарнаце кадуковай глоткі. І гэтае нешта выбіралася, вылузвалася, падцягваючыся дзясяткамі чалавечых рук, на вачах абрастаючы мёртваю плоццю людзей і жывёл.

— Божачкі, божачкі!.. — выкрыкнуў хтосьці з вугеркаўцаў, адступаючы, але не адрываючы ад істоты поўных жаху вачэй.

Яшчэ адзін папросту знерухомеў, прырос да зямлі ды, упусціўшы зброю з рук, троссся і шаптаў:

— Ну, усяго ў жыцці я пабачыў, не баюся ані навіпольцаў, ані дзікага звера, ані якога нядобрага чалавека, што жыве разбоем. Але гэта… гэтае… Неба!..

— Апошнія часы надыходзяць, — прагаварыў той, што памінаў багоў.

Гарбаносы рыцар пытальна глянуў на Доная, пасля — занепакоена, адчайна — на рэшткі карэты на ўзбочыне. Донай згодна нахіліў галаву.

— Трымаць строй! — сіпла ўскрыкнуў Шчэрба. — Абараняць нашу князёўну! Ну!..

Вокрыкамі ды штуршкамі ў яго атрымалася разварушыць сваіх вояў. Учатырох яны з паспешлівасцю (нават празмернай) рушылі да ўзбочыны, дзе вохкаў і лаяўся князеў цесць.

— Смельчакі такія, каб іх трасца, — прамармытаў Вельс. — Як на падбор.

Тое, не мёртвае, але і не жывое, зірнула вакол сябе зацягнутымі бельмамі вачыма, асцярожна высунула атрутнае джала, падцягваючы непаваротлівае разбухлае тулава. Згледзеўшы белыя корды, зайшлося немым крыкам, заплявалася і атрутай, і бледным шмаццём напаўгнілога мяса, якое імкліва адрошчвала дробныя павучыныя лапы, шчэрылася пашчамі з тонкімі вострымі ікламі, шыпела. Стаўры са злосным брахannем ганяўся за гэтаю драбязой, што, часта перабіраючы лапкамі, марна спрабавала збегчы, давіў, як каты душаць мышэй.

— Брыда, — прабурчаў Вельс, мімаходзь працяўшы бліжняе кадукова спараджэнне кордам — і тое, слаба віскнуўшы, рассыпалася белым попелам.

Іншае наляцела было на Доная, учапілася тонкімі лапкамі за нагу, намагаючыся пракусіць бот, — і адляцела ў чорную лужыну атруты ад выспятка. Нямёртвае віскліва закрычала, паказваючы выскал паўсхаванага пад высахлай скураю чэрапа. І, падцягваючыся на шматлікіх руках, хутка памкнулася наперад, хоць і было абцяжарана надзьмутым чэравам.

Пачвара ўдарыла ўсім целам, ды напаролася на Вельсаў корд — і адскочыла, гнеўна завішчала, сцякаючы смалістай чарнатою.

*«О беднае дзіцятка*, — нечакана падхапіў Донай зблытаную нітачку чужых думак, — *маё дзіцятка, мае бедныя дзетачкі!..»*

— Дзетачкі?.. — здзівіўся Донай услых.

Звер, адчуўшы ягоную замінку, з лямантам узмахнуў кіпцюрастымі рукамі, ледзь прыкрытымі напаўгнілой плоццю. Вельс адскочыў, цягнучы брата за сабой з-пад удару, і яны разам пакаціліся па зямлі. Завірыла музыка, зноў вогненная, неўтаймаваная. Белапёрыя стрэлы ў лёце спявалі злымі серабрыстымі галасамі, рассякаючы паветра, упіваліся ў зdroбленае з мёртвых цел змесціва Голаду.

Донай выдыхнуў, мацней сціскаючы ў руцэ дзяржальна Ручая. І зноў зрабіўся грозным паўночным ветрам, рвануўся, пранёсся па надзьмутым брусе, па хрыбце пачварнага стварэння. Сташчына страла клюнула паветра ля самага яго вуха. Звер, адчуўшы цяжар, забіўся,

ускідваючы незлічоныя рукі, страшна зашчоўкаў жоўтымі зубамі, спрабуючы схапіць і скінуць. І раптам заціх і задрыжаў: то Лівень, з баявым клічам рассекшы згнілае цела, прапароў чэрава Звера.

*«Дзетачкі!»*, — успыхнула ярчэй, а барвовы Голад на імгненне пагас, саступіўшы месца чамусьці іншаму, падобнаму да страху і шкадавання.

Донай, сціснуўшы зубы, сакануў Ручаём наўскос — і выродлівая мёртвая галава, закаціўшы бельмы, паляцела долу. Рана адразу ж пачарнела, быццам яе прыпяклі распаленым жалезам, і па ўсім целе Звера, знізу і зверху, пабеглі серабрыста-белыя ручаіны. Донай, навыперадкі з імклівым срэбрам, прабег па нерухомай тушы і саскочыў на зямлю. Вычварнае змесціва Голаду паступова парахнела, рассыпалася смуродлівым попелам, а ягоныя дробныя выпладкі лопаліся адзін за адным, заставаліся між каляін кучкамі гнілі.

— Другі ім зможаны кадук… — мармытаў Ясь, пачухваючы адной рукой падбароддзе, і задуменна, з выглядам самым узвышаным, углядаўся ў попел. — Паўцарства за рыфму да слова «кадук»!..

— «Грук», — жыва прапанаваў Вельс. — «Крук». І «стук», і… проста «рук».

На гэтым лютніст наморшчыў нос і адказаў зняважліва, што прасіў такую рыфму, якой ён сам яшчэ да таго не скарыстаў.

— Ну досыць, адчапіцеся! — глуха папрасіў Донай, нахмурыўшыся.

Ясь, па-ранейшаму пагружаны ў свой роздум, толькі паморшчыўся і нецярпліва адмахнуўся:

— Гэта не рыфма, Ручай.

Донай цяжка ўздыхнуў, Вельс, штурхануўшы брата ў плячо, засмяяўся. Ашчадная Сташка, спусціўшыся з пагорка, няспешна праходжвалася між кадуковых рэшткаў, нагою адграбаючы попел: шкадавала патрачаных стрэл.

Пану Адоліку тым часам дапамагалі падняцца — мяркуючы па ўсім, князеў цесць зламаў нагу. Быў бы ён маладзейшым, выгаворваў стары пан, торгаючы шчакою, быў бы ён толькі маладзейшым, дык і сам усім тут паказаў бы, любой пачвары дыхту бы даў, і ніводная дрэнь не пасмела б…

— Можаш зірнуць, што там з ім такое? — ціха шапнуў Донай брату, ківаючы на князевага цесця. — Можа, дапамагчы неяк зеллямі?

Вельс паціснуў плячыма, крануўся пляскатай паясной торбы з Нешчынымі зёлкамі.

— Магу, — адказаў сярдзіта. — Але… не хачу.

Пакуль трое вугеркаўцаў былі занятыя яе дзедам, Амена паспела ўстаць, абапіраючыся на руку паслужлівага пана Шчэрбы. Князёўна, па ўласным яе сведчанні, абышлася толькі параю нязначных драпін ды сінякоў.

— У адрозненне ад… — яна кінула пагляд на сваю мёртвую служку і скаланулася, прыкусіла вусны. Не плакала, не капрызіла, не крычала — адно моўчкі глядзела. На мёртвыя целы, на рэшткі пачвары і — крадком, скоса — на Доная, быццам спрабавала запомніць, надзейна захаваць у памяці.

— Не трэба вам… усё гэта бачыць, васпані, — вінавата сказаў ёй Шчэрба.

Амена павяла плячыма, дастаўшы насоўку, з трохі адчужаным выглядам ацерла твар. Яе рукі, сцягнутыя чорнымі замшавымі пальчаткамі, ледзь заўважна дрыжалі.

— Што ж з мяне будзе, пан рыцар, — прагаварыла Амена, абгладжваючы на сабе цяжкую аксамітную сукню, — калі стану ўвесь час адварочвацца?

Зноў зірнула на Доная — і неяк пазмрачнела, і апусціла пагляд. Сташка з-за Донаевага пляча досыць нахабна вывучала вугеркаўскую князёўну, звузіўшы вочы.



Раман-фэнтэзі з працягам
Працяг.
Друкуецца
з № 4
2019 г.

— Ага, — прагаварыла Сташка холадна. — Мая будучая сястра, значыць.

І сказала, з асуджэннем пакруціўшы носам, што вугеркаўскія дзеўкі, падобна, адно толькі і могуць, што — выратавання чакаць. Ані адвагі, ані спрыту, ані ўмення. Горка і глядзець на такую бездапаможнасць.

Донай, нахмурыўшыся, хацеў ужо ўмяшацца, але Вельс прытрымаў яго за рукаў, адцягнуў трохі ўбок.

— Не-не, — сказаў ціха. — Вось тут не лезь. Цмокі б'юцца — горы трасуцца, ведаеш?

— Добра, што ты хаця б здаровая, — працягвала Сташка дзелавіта. — І клубы шырокія. Значыць, хаця б народзіш брату дзяцей, калі больш нічога не можаш.

Амена гнеўна ўспыхнула, узялася ў бокі, змерыла Сташку зняважлівым позіркам.

— Прынамсі, — заявіла холадна, — мяне, законную спадчынніцу Алелькі Заснавальніка, выхавалі не дзе-небудзь у лесе ці на балоце, а ў бацькоўскім замку. І там навучылі не толькі сачыць за валасамі, што некаму тут зусім не пашкодзіла б, але і за ўласным языком таксама.

Сташка сыпанула здзеклівым серабрыстым смяшком.

— Не крыўдуй, будучая сястра, — папрасіла, бліснуўшы шчарбатай усмешкай. — Тут няма чаго сердаваць. Ува ўсіх нас сваё прызначэнне, ці не так?

— Толькі скуль табе ведаць чыёсь прызначэнне, дзіця камянёў, — мякка пацікавіўся Ясь, не падымаючы светлай галавы ад лютні, — калі нават не разумееш свайго?

Сташка трасянула валасамі, падняўшы звон ад бразготак, кінула ў Яся гнеўны пагляд — але лютніст, здаецца, па-ранейшаму мірна перабіраў струны і мармытаў пад нос непакорлівыя рыфмы.

— Маё прызначэнне — адно, — мовіла Сташка раўнадушна. — Люстра ёсць люстра.

— Пакуль не замгліцца, — чмыхнуўшы, адгукнуўся Ясь, і цокнуў языком, і раздражнёна ўдарыў па струнах. — Ат, не тое, не тое зусім!..

Пана Адоліка, што вохкаў, бажыўся і лаяўся амаль адначасна, у восем рук пасадзілі ў сядло — бокам, каб не турбаваць зламаную галёнку, сяк-так падвязаную. Чацвёрка навіпольскіх вараных знайшлася досыць хутка — яны мірна пасвіліся паблізу, у бярэзніку. Спаймаць атрымалася яшчэ пару вугеркаўскіх коней, якія не збрылі занадта далёка, і на аднаго села Амена, а на другога накруцілі рэчы, што князёўна ды яе вяльможны дзед везлі з сабою.

— Непадалёк, — радасна аб'явіў Шчэрба, зверыўшыся з мапай, — знаходзіцца сядзіба мясцовага дробнага ўладара — ці то Новыя Лыцавічы, ці то Новыя Рыцавічы, па назве суседняй вёскі.

— Ці не гэтыя самыя Рыцавічы, — згадаў адзін з вугеркаўцаў, — гадоў з трыццаць таму спаліў вогненны змей? Яшчэ пан Тамаш, светлай памяці, са сваімі воямі выязджаў да пагарэльцаў буданы ладзіць. Папялішча было спрэс, і людзей загінула тады, за адну ўсяго ноч, — страх! А такое было добрае селішча, і войт — харошы мужык, — і, абгладзіўшы пасівелыя вусы, абазнаны вугеркавец дадаў: — Цяперака адбудаваліся.

— Змe-е-ей? — са стогнам адгукнуўся пан Адолік. — Вось чаго яшчэ не хапала!..

Шчэрба, аднак, тут жа паспяшыў запэўніць, што ніякіх пачвар у панскай сядзібе не будзе, што там дапамогуць, дадуць і пану Адоліку, і панне Амене спакойна адпачыць. Князеў цесць закруціў носам, аціраючы пот з лысіны хусцінкаю, зацокаў незадаволена.

— Унь хамы ўсё плявузгалі, — сказаў плаксіва, — што ў Парэччы кадука забілі. А вось жа ён, кадук, ат. Жвавы, цэлы і здаровы. То бок быў здаровы, — дадаў скрозь зубы, махаючы пухлаю рукою на попел, што слаўся па палынах. — Не забіў, значыць, а? — з дакорам спытаў пан Адолік у Доная. — Адно пахваліўся?



Вельс, міла ўсміхнуўшыся, адказаў княжаму цесцю, што кадукоў, увогуле, шмат. А калі дакладней, дык да халеры. Можа, і гэты тут, у Парэччы, не апошні.

— Хто ведае, — Вельс карцінна разводзіў рукамі, пакуль пан Адолік чырванеў і задыхаўся, абмахваючыся надушанай хустачкай.

А Донай маўчаў. Падстаўляў твар сырому ветру, адчуваў сябе спустошаным і стомленым. І цела падавалася нязграбным, нязручным, няўтульным пасля палётнасці віхуры. Цела звязвала і абцяжарвала, пляценнем жыл прывязвала да зямлі, і частка Доная пакутавала і плакала, скавытала па-ваўчынаму, замкнутая ў цеснай клетцы з мяса ды касцей.

Заставацца тут не было патрэбы: без кадука шлях быў вольны, а любым іншым нягодам пан Шчэрба ды ягоныя воі здольныя былі б даць рады. Ды і Вотан мог з'явіцца па іх у любы момант, бо Істач, нябачаная крыніца Вугеры, іх чакала і клікала, адгукалася спевам прошчаў у сэрцы. Пан Адолік, праўда, заўважна захваляваўся, зразумеўшы, што і Донай, і ўсе астатнія мяркуюць сысці — асабліва калі дазнаўся, што кадукоў развялося многа.

— Як жа гэта? — спытаў князеў цесць, і ажно ягоныя віслыя шчокі затрэсліся ад неспакою. — А калі там яшчэ якія… такія? А калі там… змей вогненны?

Угавораў і доказаў пан Адолік не слухаў, трос бакенбардамі і цягнуў сваё — што вырад… Выратавальнік у сэнсе, абавязаны запэўніваць бяспеку важных асоб, пагатоў княжай сям'і. Выратоўваць, значыцца, і бараніць. А як іначай? Дарэмна, можа, выдаткавалі княжую казну на залатыя вянцы ды падобную раскошу?

На гэта Донай досыць гучна фыркнуў, ува ўсіх фарбах прыгадаўшы неймаверную раскошу сваіх першых начлегаў у Вугерцы ды ашчадна замкнуты ў куфэрак і знесены залаты вянец.

— Калі б я быў вогненным змеем, — злосна прашаптаў Вельс, сціскаючы кулакі, — я б і на паўвярсты не стаў да гэтага старога… паскудніка набліжацца. Сабе даражэй.

Нараканні, скаргі і нават пагрозы пана Адоліка і Вельса, і Доная кранаалі мала, але Амена таксама папрасіла застацца — ціха і як бы нават няўпэўнена, не падымаючы вачэй. Вельс пагардліва фыркнуў, Сташка нездаволена пакруціла носам. Але Донай, пад ціхае дзынканне Ясевай лютні, здушана прагаварыў, чырванеючы:

— М-мы… застанёмся. Пакуль што.

— Даўно б так!.. — сярдзіта адазваўся пан Адолік.

Шчэрба, што трымаў Аменінага каня пад аброць, шмаргануў носам і змерыў Доная ўважлівым позіркам.

— Я дужа ўдзячны пану Донаю, — паважліва мовіў Шчэрба з паўпаклонам. — І князь таксама будзе ўдзячны, і князева ўзнагарода не затрымаецца, хай пан Донай будзе ўпэўнены.

На словах пра ўзнагароду Донай зноў прыгадаў недарэчны вянец і ціха адказаў, што не трэба гэтым пераймацца. Шчэрба кашлянуў і стаў запэўніваць, быццам доўгай затрымкі для пана Доная з супольнікамі не будзе: адно толькі трэба пераканацца, што пан Адолік і панна Амена ў поўнай бяспецы. Рэшта клопатаў ужо — толькі Шчэрбава справа ды абавязак.

— Не магу паверыць, злыдзень, — уздыхнуў Вельс, склаўшы на грудзях рукі. — І ты гэта ўсур'ёз? Суправаджаць князевых сваякоў і іх… кепскія норавы? Ці, апроч таго, мілае лічка князёўны, — дадаў брат напаўголасу.

Донай абражана павёў бровамі і зрабіў выгляд, што апошняе недачуў.

— Калі ўзяліся дапамагаць, — нечакана адазвалася Сташка, і Вельс спачатку недаверліва прыўзняў брыво, а пасля закаціў вочы, — дык няма чаго назад паварочваць.

На гэта Вельс ціха засмяяўся і заявіў выкрывальна, быццам яна так стараецца адно таму, што яе страшэнна неабачліваму брату патрэбныя ад Амены пухлыя ружовашчокія спадчыннікі.

— І яе пасаг, землі, што Алізар за ёю дае, — спакойна працягнула Сташка. — І мір з Вугеркай. Мой брат, ружычанін, якраз-такі вельмі абачлівы — табе б варта павучыцца.

— Падступныя навіпольцы!.. — Вельс пахітаў галавою з жартаўлівым асуджэннем.

Сташка паружавела, бліскаючы шчарбатаю ўсмешкай, і Донай ля гэтых дваіх і нечага недаказанага між імі, што не называлася, але яўна, рэальна існавала, адчуў сябе лішнім.

Побач з Ясем, пагружаным у сваю новую песню, і бадзёрым Стаўры было куды прасцей. Праўда, рыфмы, якія лютніст нанізваў на ніць мелодыі, паколвалі, непакоілі, асабліва калі Ясь,

утаропіўшыся памутнелымі, невідушчымі вачыма ў Доная, мармытаў ужо сплеценыя радкі, быццам спрабуючы іх на вуснах.

Мёртвых на плашчах перанеслі на ўзбочыну — беленькую панну, што прыслужвала Амене, сівога фурмана з прабітай галавой ды пераламанага кадуком ахоўніка. З імі чакаць воза, які Шчэрба меркаваў выправіць з бліжэйшай сядзібы, заставалася двое вугеркаўцаў — той абазнаны з сівымі вусамі ды зусім малады, ажно зеленаваты з твару, які ўвесь час быццам бы пакутаваў на млосць.

— А я вас ведаю, васпане, — паведаміў Донаю сівавусы, пакуль яны разам збіралі лапнік над ярам.

Сам ён, як выявілася, быў ружыцкі, там і сям'я, там і вырас, а вось служыць багі закінулі пры двары яго княжай мосці.

— Казалі яшчэ калі, — працягваў гаваркі ружыцкі ўраджэнец, — што, маўляў, кадук з'явіўся ў Парэччы і наш хлапец упаляваў, а я і думаць не мог, што Вой-Выратавальнік, багамі пасланы, — то якраз пана Тамаша сынок.

— Няўжо — верыш? — ухмыльнуўся Донай, скідваючы сівавусаму на рукі новую яловую лапу.

Вугеркавец паціснуў плячыма.

— А чаго б не верыць, васпане? — спытаў. — Гэтак спакайней, калі верыць.

Тут ён быў вымушаны прыпыніцца: ягонага маладога таварыша вывернула-такі ў зараснікі. Той, дасюль бледны да зелянявасці і потны, заплакаў, цяжка пераводзячы дыханне. Вакол пахла попелам, крывёю ды кадуковым смуродам.

— …І як жа гэта так, дзядзьку, — слёзна шаптаў малады, — і вось быў толькі што сабе чалавек, а тут яго і няма, і ляжыць сабе, працягнуўся, бедны, і не ўзварухнецца.

— Раве, бач, — дабрадушна дзівіўся сівавусы. — Яго самі, значыць, багі ўратавалі, а ён раве. Ото ж пан Шчэрба пабачыць, якіх далікатных ваяроў у князеву ахову панабіралі.

Малады, сяк-так супакоіўшыся, па-дзіцячы пацягваў носам.

— Няўжо ў бойцы не быў? — падзівіўся Донай.

— Як не быць, васпане, — пачціва адазваўся вугеркавец. — Адно… то людзі, а то…

Ён не мог адшукаць патрэбнага слова.

— Старыя Звяры, — падказаў Донай ціха.

Малады вугеркавец, Донаеў аднагодка, паглядзеў недаверліва, развозячы па твары слёзы, змешаныя з попелам.

— Яны абуджаюцца, працягнуў Донай, — абуджаюцца там, дзе была разбурана прошча. З часам іх з'явіцца толькі болей, калі не...

Тут ён падумаў пра Істач, пра тое, што няўмольна чакае іх усіх ля вытоку вялікай ракі, і цяжка ўздыхнуў, і прыціх. А малады ахоўнік зноў задрыжаў, і сівавусы з сілай пляснуў яго па спіне.

— Не бойсь, Кайша, — сказаў, — мы ў Вугерцы — пароды мядзведжай, як аблапім каго, нават і Старога Звера, мала не пакажацца. Ды і унь цяпер пан Донай з намі, у крыўду не дасць, як што.

— Праўда ж, васпане?

— Праўда, — адгукнуўся Донай суха. І зноў згадаў пра светлавалосую панну, што прыслужвала князёўне, пра фурмана і ахоўніка. Можа, каб паспеў раней, здолеў бы адцягнуць увагу пачвары на сябе, выратаваць — усіх.

Міжвольна, быццам праз нейкае насланнё, Донай думаў пра гэта ўвесь час, пакуль разам з ахоўнікамі вяртаўся да тракта з лапнікам, пакуль яны ўтрох старанна ўкрывалі мёрт-

Раман–фэнтэзі працягам
Працяг. Друкуецца з № 4 2019 г.

вых ад дажджавой сырасці. Перабіраў у памяці ўласныя дзеянні, зноў і зноў бег па слядах Звера між парэчанскіх узгоркаў — і штораз не паспяваў нават у думках, штораз цярпеў паразу.

Вельс і двое іншых вугеркаўцаў тым часам блукалі па ваколіцы, вышукваючы коней, — абы апынуцца падалей ад князевых сваякоў, як патлумачыў брат Донаю. Сташка ўзялася агледзець пералом князевага цесця, і той, хай і не надта прыязна ставіўся да навіпольцаў увогуле, тут саступіў: падобна, сапраўды балела. Ясь, як звычайна, выкрутлівы, калі гутарка заходзіла пра якую-кольвек працу апроч музыкі, досыць жыва разгаварыўся з Аменай. Збольшага, канечне, гаварыў Ясь — прычым пра рэчы, недатычныя апошніх падзей, нават наўмысна ад іх аддаленыя. Дзіўныя простыя рэчы. У Вугерцы зараз, напэўна, значна цяплей, ды і ўвогуле там зімы не надта суровыя, праўда? А ў Парэччы звычайна куды болей снегу бывае, хаця гэтыя ўзгоркі не так далёка ад сталіцы.

Ясь разняволена балбатаў ні пра што, але гэтая нязначная гутарка, бязважкая, як пена на грабянях рачных хваль, турбавала, не дазваляла задумацца, абрынуцца ў свежыя ўспаміны пра пачвару на дарозе, і смерць зусім побач, і пыркі чужой крыві. Амена слухала, час ад часу ківала, і яе хваравітая бледнасць трохі адступала.

— Шчасце, што вы тут апынуліся ў час, — загаварыў князеў рыцар, калі яны, нарэшце, выправіліся далей па дарозе.

Амена і Донай верхам, між імі, ведучы Аменінага каня пад аброць, — Шчэрба, далей — пан Адолік, побач з якім, з аднаго боку падтрымліваючы князевага цесця, крочыў пешы вой. За ім ступаў нагружаны вузламі конь з яшчэ адным воем, побач — конны Ясь, зноў засяроджаны толькі на сваёй новай песні, і Вельс са Сташкаю, таксама верхам. Стаўры, падбрэхваючы, насіўся па дарозе, то апярэджваючы людзей, то бавячыся ззаду.

— Сапраўды, шчасце, — працягваў Шчэрба. — Дарогі на Ружыцу на княжай нарадзе палічылі бяспечнымі, таму аховы было няшмат. З іншага боку, нават і шматлікая ахова наўрад ці спыніла б пачвару.

Тут Шчэрба, мусіць, прыгадаў пра забітых, што засталіся, ўкрытыя веццем, на ўзбочыне, пад аховаю дваіх вугеркаўцаў, бо заўважна пазмрачнеў і з горыччу падціснуў вусны.

— То вы… едзеце ў Ружыцу, — прагаварыў Донай, няўклюдна падхапіўшы нітачку размовы.

Пры згадцы Замка-на-возеры балюча зашчымела сэрца. Успамінаўся і стары, і сам замак, камяні і вежы, халаднаватае рэха на плітах унутранага дворыка, галіны садовых вішняў у акне-ліхтары іх з Вельсам спальні. Звыклае, роднае, сваё, такое далёкае і недасяжнае цяпер.

— Так, туды, — сказала Амена, пакасіўшыся на яго над Шчэрбавай галавою. — Бацька меў ласку падарыць мне Ружыцкае ўладанне на мае заручыны.

У Доная абарвалася сэрца. Ён звык, нават пасля дзядзькавай смерці, нават пераконваючы сябе ў адваротным, усё-такі лічыць Ружыцу сваёй — не ўласнасцю, праўда, а хутчэй часцінкаю сябе. І зараз яе ў чарговы раз адбіралі.

— М-мае віншаванні вяльможнай пані, — з высілкам выціснуў з сябе Донай, сціскаючы павады ў пальцах так, што ажно пабялелі касцяшкі.

Князеў рыцар паважна паківаў.

— Канечне, — гаварыў Шчэрба, — стала жыць у Ружыцы ў панны Амены наўрад ці атрымаецца: пасля вяселля яна, само сабой, з’едзе ў Навіполе, да мужа. Але пакуль рыхтуецца ды пералічваецца пасаг, пакуль зладжваюцца ўсе будучыя ўрачыстасці ды баляванні, панна вырашыла завітаць у свой замак. Усё-такі гняздо роду, — дадаў Шчэрба павучальна, — самае адпа-

веднае месца, каб правесці колькі месяцаў да будучага шлюбу. Вядома, у малітвах, праведнай працы ды натхнёным роздуме, — князеў рыцар уздыхнуў, быццам ад слоў пра маленне і роздум сам расчуліўся.

Амена ж заставалася да дзіўнага безуважнай, быццам і не пра яе была гаворка, толькі раўнадушна глядзела на дарогу перад сабой. Раз-пораз, праўда, кідала на Доная кароткія паглядны і тут жа адводзіла вочы.

— А чаму паехалі не па Алелькаўскім тракце? — спытаў Донай, хапаючыся за першае пытанне, што ўсплыло ў галаве, абы не маўчаць. — Так… бліжэй было б.

Шчэрба кашлянуў і скоса зірнуў на князёўну.

— Меркавалася, — пачаў ён асцярожна, — што мы выправімся менавіта па старым тракце, нават з рэчамі ды служкамі абоз так і рушыў, за дзень да ад'езду. Але…

— Але я загадала ехаць так, — перапыніла рыцара Амена, горда ўскінуўшы падбароддзе. — Каб… канечне ж, каб паглядзець на свой будучы дом. Хаця б цераз раку.

Князеў рыцар зноў кашлянуў, гэтым разам неяк вінавата, быццам адчуваў уласную адказнасць за тое, што напаткала іх на гэтым шляху. Ці за тое, што пагадзіўся з князёўніным капрызам.

— Не-людзі, пачвары вакол, пошасць у Істачы, — Шчэрба ўздыхнуў і пахітаў галавою. — Хто б мог падумаць! У страшныя часы мы жывём, васпане.

Донай не адказаў: глядзеў на тонкія дзіды асінніку, на гарбатыя спіны пагоркаў. Сыры вецер болей не пах ані попелам, ані крывёю, ані кадуковым духам — толькі адсырэлай карою, падмоклымі рыжымі травамі на купінах ды вільготнай зямлёю. Коні пафырквалі, патрэсвалі галовамі, хапаючы ноздрамі свежыя павевы, мерна мясілі капытамі дарожны бруд.

— Вы, пэўна, былі непадалёк, васпане? — спытаў Шчэрба. — Вярталіся з Навіполя?

— З Баштавых Гацей, — Донай змушана кіўнуў і ў другі раз мусіў выслухаць, як Шчэрба паважліва даводзіць, што нечаканае з'яўленне Воя-Выратавальніка тут — сапраўднае шчасце.

— Шчасце, — ціха пагадзілася Амена, утаропіўшыся ў дарогу.

— Багі дапамаглі, не іначай, — Шчэрба набожна ўзвёў вочы да неба. — Бачыце, пан Тарс атрымаў ад сястры весткі дні, можа, тры таму, і весткі не надта… суцяшальныя.

Сташка, як выявілася, паспела напісаць брату з той заставы ля Гацей яшчэ раней за Вельса. І досыць падрабязна распавяла пра ўсе іх прыгоды — і пра Донаева знікненне ды марныя пошукі яго на балотах таксама.

— А ведаючы, якая нядобрая пагалоска ідзе пра Баштавы Гаці, — сказаў Шчэрба, — у Вугерцы вырашылі нават, што пан Донай, так бы мовіць…

Князеў рыцар кашлянуў, далікатнічаючы, і не стаў дагаворваць.

— Я… быў паранены, — адказаў Донай сціпана.

Шчэрба спачувальна паківаў, падціснуўшы вусны, Амена варухнула бровамі.

— Там жа, напэўна, — спыталася князёўна асцярожна, — таксама быў кадук? Ці нешта падобнае?

Яна задрыжала, хутаючыся ў плашч: пэўна, згадала ўласную сустрэчу з кадуком.

— Кікімара, — адазваўся Донай. — Выкрадала мясцовых дзяцей.

Уваччу так і паўставалі згубленыя камяні прошчы, спрэс аплеценыя павуціннем, і жудасныя коканы з ахвярамі Звера.

— Багі ж мае светлыя! — уздыхнуў Шчэрба, асяняючы сябе абарончым знакам.

— І ты… і яе забіў? — Амена звузіла вочы.

Донай коратка кіўнуў, і князёўна з палёгкаю выдыхнула.

— Добра, — прагаварыла, гледзячы на дарогу перад сабою. — Гэтак і трэба. Цяпер засталося толькі разабрацца з неспакоем у Істачы, і ўсё зладзіцца. Усё будзе так, як трэба, так, як раней было.

— Не, — адгукнуўся Донай. — Забіваць іх… мала. Заўжды з'явяцца новыя, разумееш? Звяры спалі, закалыханыя спевам прошчаў, а зараз той спеў сціхае, і яны… прачынаюцца.

Шчэрба зірнуў на яго падазрона і пачасаў крывы нос.

— Я не зусім разумею, што пан Донай хоча сказаць, — загаварыў Шчэрба, хмурачыся. — Гаворка пра нейкі спеў? Таму пан Донай мае з сабою музыку? Каб той… пеў для пачвар? І ці не гэты самы музыка, дарэчы, пеў у княжым замку перад апошнім Донаевым ад'ездам?..

Князеў рыцар нават пытальна азірнуўся на ўскудлачанага Яся, які, безуважны да ўсяго на свеце, рассыпаў над дарогаю звонкі перагуд струн, і бурчаў, сярдзіта наракаючы на самога сябе, і мармытаў пад нос рыфмы, як закляцці. А можа быць, гэта і былі закляцці, у якіх буйнымі перлінамі перакочваліся зарыфмаваныя словы, — Донай не здзівіўся б.

— Спеў прошчаў, значыць, — Амена пацерла падбароддзе. — Чары не-людзей, так?

— І таму мы мусім быць на Істачы ў зімовы Сонцаварот, — Донай, згодна паківаўшы, паглядзеў на князёўну, зажмурыўся ад сонечнага зайчыка, што скочыў ад залатога вянчыка ў яе валасах, і дадаў, часта міргаючы: — Васпані.

Амена пакруціла носам і прагаварыла напаўголасу, што, багі таму сведкі, гэтая Донаева няўклюдная абыходлівасць гучыць штораз, быццам нейкая недарэчная насмешка.

— Я н-не… — абурыўся Донай і, як звычайна, бездапаможна заблытаўся ва ўласных словах.

Амена змрочна змерыла яго вачыма і ўздыхнула.

— Ды ведаю, ведаю, — сказала стомлена. — Але… дапякае.

Донай, пачухаўшы патыліцу, завагаўся: можа, варта было б, пакуль ёсць магчымасць, вярнуць ёй тую шматпакутную насоўку, але пры Шчэрбе, што чуў кожнае слова, было чамусьці неяк няёмка. Ды і аніяк не выходзіла прыдумаць, як загаварыць пра гэта, асабліва так, каб ёй не дапякала, а проста шпульнуць у Амену бруднаватым шматком батысту атрымлівалася, пэўна, і зусім няхораша. Заняты этыкетнымі развагамі, Донай замаўчаў, ды і Амена, задумаўшыся і ніжэй насунуўшы капюшон плашча, прыціхла таксама. Пан Шчэрба, аднак, паспяхова гаварыў за ўсіх траіх адразу, сам сабе задаючы пытанні ды падрабязна на іх адказваючы.

А над Шчэрбавай гутаркай з самім сабою, над тупатам капытоў і ўздыхамі слоты, над панылымі парэчанскімі пагоркамі рассыпалася, быццам дробны сярэбраны дождж, быццам вераснёўская імжа, лёгкая, ласкавая, павеўная, нібы ветрык, музыка.

І Донай, апускаючы павекі, бачыў праз гэтую музыку быццам бы сябе самога, але ўсё-такі — некага іншага, не падобнага, ранейшага.

Бачыў сябе, соннага і стомленага, які трэсся ў адным з вазоў таго памятнага кудравіцкага абоза. А вакол рассцілаўся, затапляючы ўсё трывожнай барваю, крывавы захад, і сланіся жамчужныя хвалі туману над амаль чорнаю ракой. Высокі бераг нёс на карку ленаватыя звівы дарогі, што няспынна сыходзілі, незваротна сплывалі, як сама вечная, вялікая, магутная Вугера.

Сплывалі ў Далёка і Даўно.

*Працяг будзе.*

*Ілюстрацыі: Бестрамвайнасць.*